ФАРМІРАВАННЕ ІНТАРЭСУ ДА БЕЛАРУСКАГА ФАЛЬКЛОРУ ЯК УМОВА АКТЫВІЗАЦЫІ ДЗЕЙНАСЦІ ДЗІЦЯЧАГА АРКЕСТРА НАРОДНЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ

В.І.Трамбіцкая

Праблема інтарэсу здаўна займала значнае месца ў даследваннях філосафаў, сацыелагаў, грамадсказнаўцаў, псіхолагаў, бо інтарэсы людзей з'яўляюцца двіжучай сілай сацыяльнага і індывідуальнага развіцця. Вывучэннем праблем фарміравання інтарэсаў пленна займаецца і педагогіка, у тым ліку, музычная: гэта адна з фундаментальных праблем усей педагогікі, і ўмелае яе вырашэнне вельмі важна для паспяховых занятнаў па любому школьнаму прадмету. Але асаблівае значэнне яна набывае ў галіне мастацтва, дзе без эмацыянальнай захопленасці немагчыма дасягнуць якіх-небудзь вынікаў, колькі б гэтаму не надаваць намаганняў і часу.

Вывучэнню праблемы фарміравання музычных інтарэсаў дзяцей адведзена значнае месца ў даследваннях О.А.Апраксінай, Е.Я.Бурміной, Л.М.Кузняцовай, А.І.Паламарчук, К.Орфа. Значэнне інтарэса, яго ролю ў актывізацыі музычнай дзейнасці, мабілізацыі ўвагі дзяцей, трывалым засваенні імі музычных ведаў пацвярджаюць работы В.Н.Шацкай, Н.Л.Гродзенскай, Н.А.Вятлугінай і інш. Абагульняючы розныя позіркі на праблему, музычны інтарэс можна акрэсліць як выбарчую накіраванасць асобы на пазнанне музычнага мастацтва з нагоды яго эмацыянальнай прывабнасці і жыццевай значнасці, праз актыўнае імкненне да музычнай дзейнасці. Вызначаецца інтарэс становучымі адносінамі да разнабаковай музычнай дзейнасці і цягай да пэўных музычных твораў.

Сення адной з актуальных праблем з'яўляецца фарміраванне інтарэса да нацыянальнага фальклора. Спецыялісты адзначаюць, што выхаванне дзяцей на мове нацыянальнага меласа здольна захаваць і развіць традыцыі народнай культуры, выхаваць у дзяцей высокія пачуцці грамадзянскасці, маральнасці, этычнасці, сфарміраваць добры мастацкі густ. Аднак, не гледзячы на наяўнасць у сучаснай музычнай педагогіцы тэарэтычных і эксперыментальных работ па фарміраванню ў дзяцей цікавасці да фальклору (Б.Асаф'еў, Л.Баленка, А.Балгарскі, Л.Баравікоў, В.Дышлеўская, С.Ку-

лієў), некаторыя аспекты праблемы і сення не знайшлі належнай распрацоўкі. Недастаткова вывучаны, напрыклад, магчымасці этнапедагогікі на фарміраванне інтарэса да фальклора, неакрэслены перспектывы рэалізацыі сінкрэтызма фальклора у педагагічным працэсе дзіцячага музычнага калектыва. Адсутнічаюць методыкі фарміравання цікавасці да фальклора у дзяцей з розным узроўнем здольнасцей і інтарэсаў. І на жаль, меньш за іншыя вывучаны жанр інструментальнага фальклора, які на наш погляд, з'яўляецца адным з самых прывабных для дзяцей з-за сваей нагляднасці, даступнасці, прадметна-практычнага зместу.

Зыходзячы з агульна прызнанага у навуцы погляда аб адзінстве свядомасці і дзейнасці чалавека (А.Лявонцьеў, Б.Цяплоў, А.Кавалеў, С.Рубінштэйн) праблему фарміравання інтарэсаў асобы патрэбна разглядаць ва ўзаемасувязі з яе дзейнасцю. Псіхалогія адзначае адзін з найважнейшых метадаў фарміравання музычнага інтарэса: уздзеянне праз дзейнасць, з выкарыстаннем магчымасцей актыўнага кіравання інтарэсам ва ўмовах змянення і паляпшэння той дзейнасці, у працэсе якой і фарміруецца інтарэс (Л.Бажовіч, Г. Шчукіна, А.Сохар). Таму інтарэс да музычнай спадчыны свайго народа давоі паспяхова можна сфарміраваць праз музычную дзейнасць дзяцей у народна-інструментальным калектыве (аркестры, ансамблі).

Б.В.Асаф'еў акрэсліў 2 асноўныя накірункі у пошуку шляхоў фарміравання інтарэса да музычнага фальклору у дзяцей: вузкае і шырокае. Першае звязана з выкарыстаннем сродкаў музычнай выразнасці у працэсе навучання, другое – з дадатковым уключэннем у змест музычнага выхавання пытанняў этнаграфіі, якія вучаць дзяцей назіранню, аналізу, параўнанню, напрыклад, паміж музычным арнаментам і дэкаратыўным сялянскім мастацтвам. Такім чынам можна зрабіць вывад аб мэтазгоднасці спалучэння у дзейнасці дзіцячага аркестравага калектыва дзейнасці музычнай і "немузычнай": славеснай, ігравой, танцавальнай і інш.

У калектывах фальклорнага напрамку такая дзейнасць павінна мець месца, і базіравацца на тых эстэтычных каштоўнасцях, якімі з'яўляюцца народныя казкі, ігравыя песні, дзіцячы фальклор. Тым самым ствараецца спрыяльнае выхаваўчае асяроддзе для уплыва на дзяцей праз духоўную спадчыну народа, што характэрна для этнапедагогікі. Магчымасць рухацца, спяваць, падтанцоўваць, абыгрываць сюжэт песні ці музычнага ўзора вабіць дзяцей, значна ўзвы-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шае іх інтарэс да заняткаў, з'яўляецца важнай умовай актывізацыі дзейнасці дзіцячага калектыва.

Шырокае прызнанне у сусветнай практыцы музычнага выхавання атрымала сістэма Карла Орфа, якая ужывае узаемасувязь музычнага і славеснага фальклора у фарміраванні навыкаў элементарнай музычнай творчасці і выкарыстоўвае спецыяльна сканструіраваныя дзіцячыя музычныя інструменты. Але на наш погляд, на практыцы магчыма прымяненні і беларускіх народных інструментаў, здольных таксама творча развіваць дзіця пры умовах мэтанакіраванага адбора найбольш тыповых для народнай выканаўчай музычнай практыкі спосабаў засваення інструмента.

У апошні час з'явіліся работы, прысвечаныя вывучэнню этнатрадыцый (Г.Волкаў, З.Кіекбаева, М.Нікіціна, С.Раімава) і укараненню іх у практыку школы. Вывады аўтараў дазваляюць вызначыць некаторыя умовы, якія садзейнічаюць фарміраванню інтарэса да фальклору, напрыклад, выкаванне у навучанні традыцыйных народных інструментаў, цесна звязаных з працоўнай дзейнасцю народа; ужыванне традыцыйных спосабаў ігры на іх пры адначасовым творчым пераўтварэнні з мэтай арыентацыі на магчымасці дзяцей; увядзенне у педагагічны працэс вучэбна-ігравых творчых заданняў, у якіх спалучаліся б музычныя і внемузычныя спосабы засвання інструмента.

Прымяненне вучэбна-творчых заданняў значна уплывае на фарміраванне інтарэса дзяцей да фальклору, што падцвердзілася эксперыментальнымі даследваннямі (Л.Баравікоў, Л.Купрыянава, Л.Дзмітрыева і інш.). Гэта спрые значнай актывізацыі дзейнасці дзіцячага калектыва, бо мабілізуе творчы патэнцыял усіх без выключэння дзяцей, незалежна ад іх узросту і музычных здольнасцей. Таму неабходна шырока ужываць у вучэбна-выхаваўчай дзейнасці элементы імправізацыі і самастойных дзіцячых сачыненняў, як у музычнай, так і унемузычнай дзейнасці. Такая творчасць псіхалагічна блізкая дзецям, якія нават у самым раннім узросце імкнуцца да фантазіравання, самавыражэння, прадуктыўнай дзейнасці (Н.Вятлугіна).

Такім чынам, пастаянная і мэтанакіраваная работа кіраўніка дзіцячага народна-інструментальнага калектыва фальклорнага напрамку па фарміраванню інтарэса да фальклора, заснаваная на разнастайнай музычнай і унемузычнай дзейнасці, элементах фальклорнай творчасці здольна стаць дзейснай умовай актывізацыі дзейнасці такога калектыва.



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ